4. Жук, В. Н. Из истории польского национального меньшинства в БССР (20–30-е годы XX столетия) / В. Н. Жук. – Минск: Ковчег, 2008. – 52 с.

5. Жук, В. Н. Польское национальное меньшинство в БССР (1921–1939 гг.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В. Н. Жук. – Минск, 2008. – 144 л.

6. Мартин, Т. Империя положительной деятельности: Советский Союз как высшая форма империализма / Т. Мартин // Государство наций: Империя и национальное строительство в эпоху Ленина и Сталина / под ред. Р. Г. Суни, Т. Мартина. – М., 2011. – С. 88–116.

7. Мычко, Ю. В. Партийно-государственная политика в БССР в отношении польского национального меньшинства / Ю. В. Мычко // Лингвострановедческий аспект в преподавании иностранных языков: материалы Респ. науч.-практ. конф., Минск, 17 марта 2009 г. / редкол. : Н. М. Забавский [и др.]. – Минск, 2009. – С. 193–197.

8. Национальный архив Республики Беларусь (далее – НАРБ). – Ф. 42. Оп. 1. Д. 1684. Л. 147.

9. НАРБ. – Ф. 42. Оп. 1. Д. 1684. Л. 499.

10. НАРБ. – Ф. 42. Оп. 1. Д. 2023. Л. 6.

11. НАРБ. – Ф. 42. Оп. 3. Д. 274. Л. 61–62об.

12. НАРБ. – Ф. 4п. Оп. 1. Д. 3521. Л. 263–264.

13. Праца Польскага Педагагічнага Тэхнікуму ў Менску і яе сучасныя вынікі // Асвета. – 1924. – № 5. – С. 123–125.

14. Сянькевіч, Г. Р. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945 гг.) / Г. Р. Сянькевіч, А. В. Трухан, З. М. Ціток. – Мінск : Народная асвета, 1993. – 495 с.

15. Iwanow, M. Polacy w Związku Radzieckim w latach 1921–1939 / M. Iwanow. – Wrocław : Wydawnictwo Uniwersytetu Wrocławskiego, 1990. – 424 s.

## УПЛЫЎ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ НА РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ (1920-я гг.)

Каляда І. У. г. Мінск, БДТУ

У гісторыю Беларусі 1920-я гады ўвайшлі як перыяд адраджэння, росквіту беларускай культуры і мовы. І найбольш цікавай, можна

сказаць, унікальнай з’явай гэтага часу стала беларусізацыя – палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Развіццё беларускай мовы як прыярытэтны накірунак беларусізацыі і пашырэнне сферы яе ўжывання павялічыла патрэбу у беларускай кнізе, падручніку, часопісу. У сувязі з гэтым ужо ў 1921 г. было ўтворана Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, а ў 1922 г. пачало працаваць кааператыўна-выдавецкае таварыства «Адраджэнне» (перш за ўсё з мэтай выдання падручнікаў для беларускіх школ і твораў мастацкай літаратуры (у канцы 1922 г. рэарганізаванае ў выдавецтва «Савецкая Беларусь»). У 1924 г. гэтыя два выдавецтвы зліліся ў адзінае Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, планы якога прадугледжвалі выданне літаратуры на мовах народаў розных нацыянальнасцей, што пражывалі на Беларусі. І калі ў 1924 – 1925 гг. Белдзяржвыдавецтва выдавала кнігі на 4-х мовах – беларускай, рускай, яўрэйскай і польскай, то ў 1927 – 1928 гг. – ужо на 6-ці (яшчэ на літоўскай і латышскай) [1, с. 229].

На беларускую мову паступова пераводзіліся газеты і часопісы. У 1927 г. на беларускай мове выдаваліся газеты – «Савецкая Беларусь», «Звязда», «Беларуская вёска», «Чырвоная змена»; часопісы – «Полымя», «Маладняк», «Узвышша». Разам з тым выдаваліся газеты і часопісы і на мовах нацыянальных меншасцей: на польскай мове – газета «Орка», на рускай – «Рабочий», «Заря Запада», «Полесская правда», на яўрэйскай – газета «Акцябр», для моладзі – «Юнгер-Арбайтэр», часопіс «Штэрн», на літоўскай мове – газета «Чырвоны араты». Наогул, у 1928 г. з 17 рэспубліканскіх газет 9 выходзілі на беларускай мове, 4 – на рускай, 2 – на польскай, 1 – на яўрэйскай і 1 – на літоўскай [2, с. 29 – 30].

Да канца 1929 г. на Беларусі налічвалася пяць рэспубліканскіх выдавецтваў: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, газетна-часопіс-нае выдавецтва ЦК КП(б)Б «Звязда», ЦК ЛКСМ «Чырвоная змена», «Савецкая Беларусь», выдавецтва ЦСПСБ. Несумненна, што пашырэнне выдавецкай справы ў 1920-я гады адыграла значную ролю ў развіцці народнай асветы, нацыянальнай культуры, навуковых ведаў. Павялічылася выданне як беларускай літаратуры, так і твораў рускай і сусветнай класічнай літаратуры ў перакладзе на беларускую мову, што дазволіла бліжэй пазнаёміцца з творчасцю славутых пісьменнікаў, а таксама адкрыць для сябе і новыя малавядомыя імёны.

Рост нацыянальнай самасвядомасці прабудзіў інтарэс да гісторыі роднага краю ў самых шырокіх колах насельніцтва, што, у сваю чаргу, прывяло да павелічэння матэрыялаў па гісторыі Беларусі. Вакол Інбелкульта аб'ядналіся навуковыя сілы, мэтай якіх было грунтоўнае і ўсебаковае вывучэнне беларускай мінуўшчыны. Асабліва інтэнсіўна пачалася іх праца з восені 1925 г., калі была арганізавана гістарычна-археалагічная камісія на чале з прафесарам М. Доўнар-Запольскім, што пачала друкаванне гістарычных крыніц пад назвай «Беларускі архіў».

Пачынаючы з 1924 г. на Беларусі масава ўзнікаюць краязнаўчыя арганізацыі – мясцовыя, раённыя, акруговыя. Іх дзейнасць была шырокай і разнастайнай: праводзіліся навуковыя экскурсіі, экспедыцыі, збіраліся экспанаты для музеяў, фальклорныя творы, выдаваліся рукапісныя зборнікі і часопісы. У пачатку 1928 г. на Беларусі налічвалася ўжо 301 краязнаўчая арганізацыя і 18 музеяў (у Віцебску, Мінску, Гомеле, Магілёве, Слуцку, Полацку, Мазыры) [3, с. 259]. Вялікай папулярнасцю карыстаўся часопіс «Наш край», дзе асвятлялася праца краязнаўчых гурткоў. Выходзілі таксама і мясцовыя неперыядычныя зборнікі («Віцебшчына», «Полаччына», «Магілёўшчына»).

У 1920-я гады ў даволі складаных умовах развівалася беларуская літаратура, для якой былі характэрны творчыя пошукі і цікавыя знаходкі. У гэты час на Беларусі дзейнічала некалькі літаратурных аб'яднанняў. У 1923 г. утвараецца «Маладняк», які сабраў маладых паэтаў, празаікаў, драматургаў (М. Чарот, А. Александровіч, А. Дудар, У. Дубоўка, А. Вольны, Я. Пушча, К. Крапіва, П. Трус, П. Глебка, К. Чорны, М. Лынькоў). Асноўны напрамак сваёй дзейнасці літаратары бачылі ў пошуках літаратурных талентаў сярод народа, новых форм, сродкаў і прыёмаў у літаратуры. Разам з тым многія маладнякоўцы недаацэньвалі значэнне класічнай спадчыны, супрацьпастаўлялі маладых пісьменнікау «старым».

У 1926 г. утвараецца новае літаратурна-мастацкага згуртаванне «Узвышша» (А. Бабарэка, З. Бядуля, П. Глебка, У. Дубоўка, К. Крапіва, М. Лужанін, Я. Пушча, К. Чорны), для якога было характэрна захаванне культурнай спадчыны і нацыянальных традыцый праз павышаную ўвагу да беларускай мовы і беларускай жанравасці, імкненне захапіць моладзь ідэямі будаўніцтва новай культуры праз выражэнне таго, чым багата Беларусь.

На мяжы 1927 – 1928 гг. сфарміравалася яшчэ адно літаратурнае аб'яднанне – «Полымя», куды ўвайшлі разам з маладымі і пісьменнікі больш старэйшага пакалення, у тым ліку Я. Колас, Я. Купала, Ц. Гартны, А. Вольны, А. Гурло, М. Зарэцкі, М. Чарот і інш. Свае задачы яны звязвалі з удасканаленнем нацыянальнай формы. У той час выйшлі зборнік вершаў «Спадчына» Я. Купалы і яго паэма «Безназоўнае», паэмы Я. Коласа «Новая зямля» і «Сымон-музыка» і яго аповесць «У глыбі Палесся», аповесць Ц. Гартнага «Сокі цаліны». У канцы 1920-х гг. адносна дэмакратычны перыяд літаратурнага жыцця скончыўся. Свабода творчасці ўсё больш стала заганяцца ў рамкі ўстановак і патрабаванняў бальшавіцкай ідэалогіі.

Разам з літаратурай набірала моц нацыянальнае тэатральнае мастацтва. Першы беларускі дзяржаўны тэатр быў створаны яшчэ ў 1921 г., яго ўзначаліў Е. Міровіч, выдатны рэжысёр, драматург і акцёр. Побач з класікай ён ставіў і творы беларускіх драматургаў: гэта п'есы М. Чарота «На купалле», В. Гарбацэвіча «Вяселле», Я. Купалы «Раскіданае гняздо», Е. Міровіча «Кастусь Каліноўскі». Тут пачыналі працаваць такія акцёры, як К. Уладамірскі, Б. Платонаў, Л. Ржэцкая, В. Галіна, чыё прафесійнае майстэрства ў хуткім часе стала вядома далёка за межамі Беларусі.

У 1921 г. для падрыхтоўкі нацыянальных акцёрскіх кадраў па ініцыятыве Наркамата асветы БССР у Маскве была арганізавана Беларуская драматычная студыя (у 1923 г. атрымала статус ВНУ –мела назву Беларускі дзяржаўны інстытут мастацтва). У 1926 г. студыя прыбыла ў Віцебск, дзе была рэарганізавана ў Другі беларускі дзяржаўны тэатр (мастацкі кіраўнік – С. Хачатураў). На сцэне тэатра працавалі такія акцёры, як С. Станюта, Р. Кашэльнікава, П. Малчанаў.

У Мінску яшчэ ў 1920 г. пачала дзейнічаць Беларуская тэатральная трупа пад кіраўніцтвам У. Галубка, вядомага беларускага пісьменніка, рэжысёра, акцёра. У 1926 г. трупа была пераўтворана ў Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр (з 1932 г. –Трэці Беларускі дзяржаўны тэатр), які выступаў у мінскіх клубах, а таксама паказваў спектаклі па ўсёй Беларусі. Тэатр прытрымліваўся традыцый беларускай нацыянальнай культуры, і спектаклі яго, насычаныя музыкай, песнямі, нацыянальным каларытам, карысталіся вялікай папулярнасцю ў народзе.

У 1929 г. на Беларусі налічвалася ўжо шэсць тэатраў – акрамя вышэйназваных яшчэ Дзяржаўны яўрэйскі тэатр, Яўрэйскі і Польскі

вандроўныя тэатры, шматлікія студыі і самадзейныя тэатральныя калектывы.

Развіццё тэатральнага мастацтва ў 1920-я гады ішло ў агульным рэчышчы беларусізацыі: у гэты перыяд выпрацоўваліся суадносіны класічнага рэпертуару і тагачасных сцэнічных твораў, з улікам папярэдніх театральных традыцый закладваліся асновы новых, ішоў пошук удасканалення прафесійнага майстэрства адпаведна задачам стварэння новага грамадства.

Сезон 1927 – 1928 г. супаў з пачаткам узмацнення ідэалагічнага тэрору з боку савецкай улады. Афіцыйная палітыка ў тэатральнай справе накіроўваецца на выцясненне п'ес, прысвечаных жыццю беларускага народа. Усё большае месца ў тэатральнай афішы займаюць ідэалізаваныя творы «пралетарскага» зместу [4, с. 182].

У 1920-я гады становіцца вядомым беларускае выяўленчае мастацтва. Трэба адзначыць, што калі новая беларуская літаратура магла абаперціся на родную мову, на вопыт сваіх папярэднікаў (В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча) і імёны ўжо шырока вядомых майстроў слова – Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, – то новае беларускае мастацтва такой апоры не мела. Мастакі, якія працавалі на Беларусі ў 1920-я гады (А. Грубэ, М. Дучыц, А. Касцялянскі, І. Мільчын), мала што ведалі пра беларускія мастацкія традыцыі, пра сваіх папярэднікаў.

Вывучэнне гісторыі беларускага мастацтва пачалося па ініцыятыве выдатных беларускіх мастацтвазнаўцаў – М. Шчакаціхіна і М. Касьяровіча. Першы арганізаваў пры БДУ кафедру гісторыі беларускага мастацтва і ўначаліў працу Камісіі гісторыі мастацтва секцыі беларускага мастацтва пры Інбелкульце. М. Касьпяровіч наладзіў вывучэнне гісторыі беларускага мастацтва пры Віцебскім мастацкім тэхнікуме і шмат зрабіў для папулярызацыі здабыткаў вывучэння мастацкага мінулага Беларусі.

Пазнанне мінулага дапамагала вызначыцца новым накірункам у выяўленчым мастацтве, такім як рэалістычны накірунак (В. Волкаў, М. Дучыц), імпрэсіяністкі (У. Кудрэвіч), неарэалістычны (М. Філіповіч, І. Ахрэмчык), дэкаратыўны (А. Марыкс, У. Ціханаў).

Рубяжом, з якога пачынаецца прынцыпова новы этап у выяўленчым мастацтве Беларусі можна лічыць 1925 г., калі ў Мінску адкрылася першая Усебеларуская мастацкая выстава, якая дапамагла выявіць мастакоў, працаваўшых на Беларусі і пазнаёміла

з іх творчасцю працоўных рэспублікі. У 1927 г. было створана Усебеларускае аб'яднанне мастакоў (А. Грубэ, І. Дучыц, П. Мрачкоўская, А. Астаповіч, А. Тычына і інш.), што ставіла сваёй мэтай згуртаванне выяўленчых сіл Беларусі, распрацоўку развіцця беларускага выяўленчага мастацтва, садзейнічала арганізацыі выстаў, студый і г.д. Акрамя Мінска існавалі філіялы ў Віцебску, Гомеле, Магілёве, а таксама ў Маскве і Ленінградзе.

У 1928 г. пачало дзейнічаць Беларускае мастацкае таварыства «Прамень» (А. Вало, У. Бохан, У. Кавалёў, В. Мурашоў, В. Ціхановіч), дзейнасць якога была разнастайнай: гэта і лабараторныя практычныя заняткі, даклады па гісторыі мастацтва, аб беларускім народным мастацтве, публічныя лекцыі, вечары, дыспуты, а таксама падарожжы па БССР і СССР з мэтай знаёмства з мастацкай творчасцю розных народаў.

На жаль, спрыяльныя ўмовы для развіцця нацыянальнага мастацтва фактычна існавалі ўсяго тры гады – з 1927 па 1930. Але шмат з таго, што было зроблена за гэты час, можна на поўнай падставе аднесці да нашай мастацкай класікі.

У 1924 г. быў прыняты дэкрэт СНК БССР аб утварэнні Дзяржаўнай управы па справах кіно. Вытворчая дзейнасць Белдзяржкіно пачынаецца з 1926 г., калі быў створаны першы мастацкі фільм «Лясная быль» (рэжысёр Ю. Тарыч) паводле аповесці М. Чарота «Свінапас». За даволі кароткі тэрмін гэтая маладая арганізацыя не толькі арганізавала кіно ў гарадах, але і пачала сваю дзейнасць на вёсцы, дзе працавалі кінаперасоўкі.

Першыя беларускія мастацкія фільмы па сваей тэматыцы падзяляліся на фільмы, прысвечаныя грамадзянскай вайне («Лясная быль», «Хвоі гамоняць»), гісторыка-рэвалюцыйным падзеям («Кастусь Каліноўскі»), барацьбе ў Заходняй Беларусі («Да заўтрага»), мірнаму будаўніцтву («Песня вясны»).

У 1920-я гады разгортваецца дзейнасць культурна-асветніцкіх устаноў. Цэнтрам палітычнай і культурна-асветніцкай работы на вёсцы сталі хаты-чытальні, народныя дамы, дзе праводзіліся чыткі газет і часопісаў, былі арганізаваны палітычныя гутаркі, гурткі мастацкай самадзейнасці. Важнае месца ў павышэнні культурнага ўзроўню людзей, фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва належыла бібліятэкам.

Прапаганда беларускай гісторыі, народнай творчасці вялася Дзяржаўным музеем, які быў створаны ў жніўні 1923 г. у Мінску. У 1928 г. ён налічваў пяць аддзелаў: гісторыка-археалагічны, нумізматычны, этнаграфічны, царкоўна-археалагічны і мастацкі. Музей накіроўваў экспедыцыі на Случчыну, Бабруйшчыну, Мазыршчыну, Міншчыну для вывучэння старажытных будынкаў, цэркваў, розных мастацкіх помнікаў.

Такім чынам, у гады беларусізацыі было нямала зроблена па фарміраванню нацыянальнай свядомасці народа, уздыму яго культурнага ўзроўню. Шырока вялося вывучэнне культуры і гісторыі беларускага народа; узрасла шматлікая маладая плынь беларускіх пісьменнікаў, якая прынесла ў беларускую літаратуру новыя цікавыя творы; быў закладзены фундамент беларускага нацыянальнага тэатру; у гэтыя гады становіцца вядомым беларускае выяўленчае мастацтва, для якога былі характэрны разнастайныя плыні, творчыя пошукі новых мастацкіх формаў; пачало сваю дзейнасць беларускае кіно.

**Выкарыстаныя крыніцы і літаратура**

1. Восьмы Ўсебеларускі з’езд Саветаў. Стэнаграфічная справаздача. – Мінск: Выд-ва ЦВК БССР, 1927. – 486 с.

2. Асноўныя вынікі работы ўраду БССР. Да перавыбараў Саветаў. 1928 – 1929 г. – Мінск: Выд-ва ЦВК і СНК БССР, 1928. –150 с.

3. Трэпет, Л. Краязнаўства. / Л. Трэпет // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск, 1997. – Т. 4. – С. 257-260.

4. Глыбінны, Ул. З гісторыі беларускага тэатру. Тэатральная дыскусія 1928/1929 / Ул. Глыбінны // Спадчына. – 1997. – № 3. – С. 182 – 191.

## РОЛЬ БЕЛОРУСОВ В ФОРМИРОВАНИИ ЭТНИЧЕСКОГО ПРОСТРАНСТВА КУБАНИ И СЕВЕРНОГО КАВКАЗА (ИСТОРИОГРАФИЧЕСКИЙ АСПЕКТ ПРОБЛЕМЫ)

Крючек П. С. г. Минск, БГТУ

Среди множества народов, внесших свой вклад в формирование этнического пространства Северного Кавказа и Кубани были и белорусы. К сожалению, в современной российской и белорусской историографии данная проблема не получила широкого освещения.